УДК 332.2.021(476)(091)

# ПРАБЛЕМА ГАРАДСКОГА ЗЕМЛЕЎПАРАДКАВАННЯ Ў БССР У ПЕРЫЯД НЭПА (1921–1928 гг.)

***Т. У. Пецюкевіч***
аспірант
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

*Важным фактарам развіцця горада з'яўляецца рацыянальнае выкарыстанне зямельных рэсурсаў. Пад гарадскім землеўпарадкаваннем вызначаюцца мерапрыемствы па ўнясенні змен у плошчу, размяшчэнне, структуру, межы гарадскіх тэрыторый у мэтах стварэння ўмоў для іх рацыянальнага выкарыстання і функцыянавання гарадской гаспадаркі. Аўтарам разглядаецца праблема ідэнтыфікацыі гарадскіх зямель па сродках усталявання гарадской мяжы, а таксама асаблівасці эксплуатацыі і ўліку гарадскіх зямель на тэрыторыі БССР у перыяд НЭПа.*

**Ключавыя словы:** *землеўпарадкаванне, гарадскія землі, гарадская мяжа, камунальная гаспадарка.*

## Уводзіны

Для рацыянальнага развіцця гарадоў вялікае значэнне мае кіраванне і эксплуатацыя гарадскога зямельнага фонду. Кастрычніцкая рэвалюцыя, скасаваўшы права прыватнай уласнасці на зямлю, актуалізавала пытанне гарадскога землеўпарадкавання, рэгламентацыя якога адбывалася на працягу разглядаемага перыяду.

Дадзеная праблема разглядалася ў шэрагу артыкулаў, прысвечаных аспектам прававога рэгулявання зямельных адносін у гарадах у перыяд НЭПа. Юрыдычнае афармленне эксплуатацыі гарадскіх зямель аналізуецца Т. Ф. Яшчук у артыкуле «Зямельныя адносіны ў гарадах: вопыт прававога рэгулявання ў перыяд НЭПа» [1]. Асобным аспектам заканадаўства прысвечаны артыкулы Л. Ф. Няфёдава: «Прававое замацаванне зямельнай рэнты ў савецкім заканадаўстве» [2], «Органы кіраўніцтва гарадскімі землямі і іх паўнамоцтвы ў РСФСР (1918 – канец 1940 гг.)» [3], «Прававое значэнне Палажэння аб зямельных распарадках у гарадах 1925 г.» [4].

## Асноўная частка

У дарэвалюцыйны перыяд гарады распараджаліся даволі вялікім зямельным фондам, у межах сялібных тэрыторый знаходзіліся землі прыватных уласнікаў і органаў гарадскога самакіравання. Асноўная частка зямель, якія складалі рэзерв для пашырэння горада, размяшчалася за мяжой сялібных тэрыторый. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі паўсталі пытанні ідэнтыфікацыі гарадскіх тэрыторый, іх уліку і эксплуатацыі.

Дэкрэт ад 20 жніўня 1918 г. «Аб знішчэнні права прыватнай уласнасці на нерухомасць у гарадах» перадаў гарадскія землі ў распараджэнне органаў мясцовай улады. Інструкцыя Наркамзема па прымяненні палажэння аб сацыялістычным землеўпарадкаванні» ад 8 ліпеня 1919 г. надзяліла гарадскія саветы правам распараджацца гарадской зямлёй, у тым ліку сельскагаспадарчай. Землі па-за гарадской мяжой знаходзіліся ў сферы кампетэнцый Народнага камісарыяту земляробства. «Палажэнне аб камунальных аддзелах» ад 18 красавіка 1920 г. абмежавала кантроль гарадскіх улад асобнымі ўчасткамі як на гарадской тэрыторыі, так і па-за яе межамі, якія былі адведзены губернскімі зямельнымі аддзеламі [5, с. 832]. Гарадскія землі перадаваліся камунальным аддзелам, якія адказвалі за вядзенне мясцовай гаспадаркі.

У заканадаўстве вызначэнне гарадскіх зямель ажыццяўлялася з выкарыстаннем прыкметы «гарадской мяжы», таму ідэнтыфікацыі гарадской зямлі надавалася значная ўвага [3, с. 68]. Пастановай Прэзідыума ЦВК БССР ад 29 сакавіка 1923 г. было дэкларавана правядзенне мерапрыемстваў па ўсталяванні межаў гарадоў [6, с. 2]. Дадзенае пытанне рэгламентавалася Зямельным кодэксам БССР, уведзеным у дзеянне 15 красавіка 1923 г.

Пад актуальнай гарадской мяжой Зямельны кодэкс вызначыў знешнюю мяжу зямель, якія знаходзіліся ў вядзенні гарадскіх Саветаў на 1 мая 1923 г., і прылеглых былых гарадскіх зямель, калі яны не знаходзіліся ў фактычным карыстанні сялян або рабочых арганізацый. Такім чынам, пры вызначэнні складу гарадскіх зямель выкарыстоўваўся метад выключэння: гарсаветы маглі юрыдычна замацоўва-

© Пецюкевіч Т. У., 2024

ць права на ўчасткі, у адносінах да якіх такія правы адсутнічалі ў іншых карыстальнікаў. Справа аб пашырэнні гарадской мяжы ўзбуджалася гарадскім Саветам або НКУС, пры ўзнікненні спрэчак пераходзіла на канчатковае вырашэнне ў Прэзідыум ЦВК. Землі за межамі актуальнай гарадской мяжы, якія абслугоўвалі гарадскія камунальныя прадпрыемствы, замацоўваліся за імі [6, с. 17]. У выпадках забудовы прылеглых да горада тэрыторый або размяшчэння там камунальных прадпрыемстваў гарадская мяжа ўключала гэтыя землі ў склад горада [6, с. 18]. Зямельныя распарадкі ўнутры гарадской мяжы рэгламентаваліся спецыяльнымі заканадаўчымі актамі.

Працэс вызначэння гарадской мяжы суправаджаўся спрэчнымі пытаннямі. Так, у верасні 1923 г. жыхарамі хутара Назараўка было пададзена хадайніцтва аб выключэнні хутара з ліку гарадскіх зямель Бабруйска і далучэнні яго да бліжэйшых валасцей. Бабруйскі камунаддзел канстатаваў, што хутар уваходзіць у гарадскую мяжу з 1853 г. і знаходзіцца ў цэнтры гарадскіх зямель. Улічваючы факт зацвярджэння гарадской мяжы 30 красавіка 1923 г., камунаддзел «не знаходзіў магчымасці зноў вяртацца да гэтага пытання» [7, арк. 22].

У 1924 г. быў выдадзены шэраг пастаноў, рэгламентуючых памер гарадскіх тэрыторый. Пастанова Прэзідыума ЦВК БССР ад 16 мая 1924 г. вызначыла пяцівярстовы радыус для акруговых і павятовых гарадоў у якасці агульнага прынцыпу. На пасяджэнні Прэзідыума ЦВК, СНК і старшынь акрвыканкамаў 5 лістапада 1924 г. было прынята рашэнне радыус усіх гарадоў, за выключэннем Мінска і Віцебска, вызначыць ад 3 да 5 вёрст [8, арк. 12].

Пры абмежаванні гарадскіх зямель Магілёва гораду было адведзена толькі 3500 дзесяцін зямлі пры тым, што ў дарэвалюцыйны перыяд яго тэрыторыя складала 6500 дзесяцін. У кастрычніку 1924 г. пытанне разглядала Вышэйшая зямельная камісія і накіравала праект на дапрацоўку [8, арк. 121]. Асноўнай прычынай сталі шматлікія скаргі грамадзян, якія не жадалі ўваходжання ў гарадскую мяжу і імкнуліся прылічыць сябе да сельскага насельніцтва, каб не плаціць падаткі на зямлю, утрыманне жывёлы і забудовы ў гарадах [9, арк. 15].

У верасні 1924 г. віцебскі камунаддзел дакладаў у Галоўнае кіраўніцтва камунальнай гаспадаркі, што працы па ўсталяванні гарадской мяжы скончаны. Адзначалася, што гарадскія землі варта абмежаваць радыусам ад 3 да 4 вёрст, таму што далей знаходзяцца землі выключна вясковыя, якія немэтазгодна ўключаць у склад горада [8, арк. 62]. Канчатковае зацвярджэнне гарадской мяжы Віцебска адбылося толькі ў лютым 1925 г.

Варта адзначыць, што на далучаных да БССР у выніку першага ўзбуйнення тэрыторыях паветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў да красавіка 1925 г. дзейнічаў Зямельны кодэкс РСФСР 1922 г., аднак рэгламентацыя гарадскога землеўпарадкавання не мела значных адрозненняў ад адпаведных нормаў, змешчаных у Зямельным кодэксе БССР 1923 г.

Гарадская мяжа Мінска была зацверджана 30 красавіка 1923 г., аднак пазней было прынята рашэнне аб яе пашырэнні [7, арк. 10]. Новая мяжа сталіцы БССР была зацверджана Мінскай акруговай зямельнай камісіяй 29 студзеня 1925 г., абмежавана ў натуры і заснята на плане [7, арк. 170]. Плошча гарадской тэрыторыі Мінска склала 13.944 дзес. і была больш за старую амаль у 4 разы [9, арк. 5].

Працы па абмежаванні гарадоў зацягнуліся. Дадзенае пытанне абмяркоўвалася 9 лютага 1925 г. на пасяджэнні сельскагаспадарчай секцыі Дзяржплана БССР, якое канстатавала неабходнасць перагляду пытання абмежавання гарадоў сумесна з фінансава-эканамічнай секцыяй і Галоўным кіраўніцтвам камунальнай гаспадаркі па прычыне неадпаведнасці памераў гарадскіх тэрыторый рэальным патрэбам гарадоў [8, арк. 15].

1 красавіка 1925 г. для ўсёй тэрыторыі БССР быў уведзены новы Зямельны кодэкс, дзеянне Зямельнага кодэкса РСФСР 1922 г. на далучаных у выніку ўзбуйнення 1924 г. тэрыторыях было адменена [10, с. 1]. З уводзеннем новага Зямельнага кодэкса адбылася ўніфікацыя зямельнага заканадаўства на тэрыторыі рэспублікі. Пытанне эксплуатацыі гарадскога зямельнага фонду не атрымала значных зменаў.

У ліпені 1925 г. пры кіраўніцтве камунальнай гаспадаркі была сабрана нарада па зямельным пытанні з удзелам прадстаўнікоў акруговых камунаддзелаў. Было адзначана, што ў выніку абмежавання пяцівярстовым радыусам у склад акруговых гарадоў была ўключана вялікая колькасць вёсак, тэрыторыя якіх не прыносіла прыбытак гарадам па прычыне абкладання яе адзіным сельскагаспадарчым падаткам, а не зямельнай рэнтай. На адміністрацыйнае абслугоўванне гэтых тэрыторый ішла значная частка мясцовых бюджэтаў,

што выклікала пытанне аб мэтазгоднасці павелічэння гарадской мяжы. Напрыклад, Мінск пасля пашырэння сваёй тэрыторыі ў студзені 1925 г. набыў 5000 дзесяцін лесу, 2000 дзесяцін пад зялёныя насаджэнні, 1600 дзесяцін саўгасаў, але разам з тым у склад горада ўвайшлі 15 вёсак, з абслугоўваннем якіх горад ужо адчуваў цяжкасці [11, арк. 102]. Вынікам нарады па пытанні гарадской мяжы стала рэкамендацыя камунаддзелам кіравацца пяцівярстовым радыусам як максімальным, але ў кожным выпадку ўлічваць эканамічную мэтазгоднасць, попыт на зямлю пад забудову, здольнасць абслугоўвання жыхароў далучаных тэрыторый і, па магчымасці, прыслухоўвацца да жаданняў насельніцтва [11, арк. 103].

Яшчэ адным недахопам мерапрыемстваў па абмежаванні гарадоў з'яўлялася адсутнасць аднастайнага плана правядзення прац. Некаторыя гарады правялі мерапрыемствы па адвядзенню гарадской мяжы без юрыдычнага афармлення праекта. У такой сітуацыі дастаткова было адной скаргі, каб праект быў накіраваны на перагляд [7, арк. 112]. У сувязі з гэтым НКУС прапанаваў аформіць усе праекты праз зямельныя органы і да 1 лютага 1926 г. прадставіць іх у НКУС [7, арк. 112 зв].

29 студзеня 1926 г. Прэзідыум ЦВК БССР адмяніў пастанову ЦВК і СНК ад 16 мая і 5 лістапада 1924 г. у частцы, якая тычылася ўсталявання радыусу гарадскіх зямель ад трох да пяці вёрст. Зробленыя паводле гэтых пастаноў абмежаванні гарадскіх тэрыторый пакідаліся ў сіле, а ў далейшым акрвыканкамам неабходна было дзейнічаць толькі на падставе палажэнняў Зямельнага кодэкса [7, арк. 148].

Ідэнтыфікацыя гарадской тэрыторыі суправаджалася не толькі вызначэннем вонкавай мяжы, але і мерапрыемствамі па апісанні зямельных участкаў унутры горада з выяўленнем іх фактычных землекарыстальнікаў. Значная частка зямель знаходзілася пад прыватнымі жылымі забудовамі, нацыяналізаванымі прамысловымі прадпрыемствамі, а таксама ўстановамі, якія не былі ніяк звязаны з мясцовым кіраўніцтвам і гаспадаркай [1, с. 20].

Для ацэнкі зямельных рэсурсаў горада і іх дакладнага ўліку праводзілася рэгістрацыя зямельных участкаў. Дадзены працэс распачаўся з 1922 г. на аснове паказанняў землекарыстальнікаў, у выніку чаго мела месца двайная рэгістрацыя аднаго ўчастка некалькімі ўладальнікамі, а інфармацыя наконт прыбытку з асобных зямель увогуле адсутнічала. Ацэнка зямельных рэсурсаў гарадоў і іх прыбытковасці аказалася вельмі прыблізнай. Дзеля атрымання дакладных дадзеных праводзіліся каморніцкія здымкі, якія, аднак, ахоплівалі не ўсе тэрыторыі. Так, у 1922 г. у Мінску было вымерана толькі 600 з 7000 зарэгістраваных зямельных участкаў [12, арк. 105].

Пытанне ўнутранага землекарыстання рэгламентавала «Палажэнне аб зямельных распарадках у гарадах», зацверджанае ЦВК і СНК БССР 18 верасня 1925 г. Згодна з ім уся тэрыторыя зляснымі насаджэннямі і вадаёмамі ў межах гарадской мяжы знаходзілася ў непасрэдным вядзенні органаў мясцовай гаспадаркі выканаўчых камітэтаў. Выключэннем былі землі, якія ўваходзілі ў сферы кампетэнцый адпаведных камісарыятаў, – тэрыторыі чыгункі, водных шляхоў міжгарадскога транспарту, ваенных аб'ектаў [13, с. 2].

Гарадскія землі падзяляліся на тры групы па прыкметах эканамічнага і сацыяльнага прызначэння [4, с. 135]. Першую групу складалі сялібныя тэрыторыі – плошчы, якія былі выкарыстаны ці будуць выкарыстоўвацца пад забудову. Да другой траплялі землі агульнага карыстання, якія ўключалі ў сябе дарогі, вуліцы, набярэжныя, вадаёмы; зоны для адпачынку (паркі, сады, скверы, бульвары); звалачныя месцы для вывазу смецця і снегу [13, с. 7]. У трэцюю групу ўваходзілі лясы і землі сельскагаспадарчага карыстання (выганы, лугі, палеткі, агароды, фруктовыя сады). Гаспадарка ў гарадскіх лясах павінна была насіць паркавы характар, але дазвалялася касьба і выпасванне хатняй жывёлы.

Асноўная частка гарадскіх зямель з'яўлялася муніцыпальнай уласнасцю. Самай распаўсюджанай формай эксплуатацыі зямлі ў перыяд НЭПа стала перадача яе ў арэнднае карыстанне ўстановам, прыватным асобам і аб'яднанням. Да 1922 г. зямля для апрацоўкі давалася ў бясплатнае карыстанне, потым была ўведзена арэндная плата. На працаздольнага члена сям'і адпускалася ад 60 да 100 кв. сажняў, а ў выпадку, калі земляробства з'яўлялася асноўным заняткам, – да 112 дзесяцін. Арэндныя дамовы складаліся тэрмінам на 6 гадоў [14, арк. 61]. Так, за 1922 г. у арэнднае карыстанне ўстановам і кааператывам было перададзена каля 20% гарадской зямлі ў Мінску [15, с. 2].

Кошт арэнднай зямлі вар'іраваўся ў залежнасці ад месцазнаходжання ўчастка. Так, у 1923 г. арэнда 1 дзесяціны зямлі ў цэнтры Мінска каштавала 15 руб., за 2-3 км ад цэнтра – 12 руб., на ўскраінах – 10 руб. [16, с. 3].

Улады меркавалі, што з цягам часу попыт на сельскагаспадарчую зямлю будзе скарачацца, чаго нв самой справе не адбылося. Так, попыт на зямлю ў Мінску ў 1923 г. быў настолькі высокі, што вясной назіраліся выпадкі засявання пад агароды ўскраінных вуліц. Перад гарадскімі ўладамі паўстала задача забеспячэння горада дастатковай плошчай для патрэб ваенных стрэльбішчаў, аэрадрома, звалачных месцаў, палеткаў і выганаў для гарадской жывёлы. Згодна з перапісам 1922 г. у Мінску налічвалася 3000 галоў буйной рагатай жывёлы, 1500 коней і 2000 коз [12, арк. 104 зв].

Высокі попыт на зямлю ў Калінінску прывёў да таго, што частка запасных зямельных і лугавых участкаў была размеркавана паміж земляробскім насельніцтвам, астатняя частка здавалася па дамовах у арэнднае карыстанне. У выніку горад не меў магчымасці адвесці новыя сялібныя ўчасткі без пашырэння гарадской мяжы [9, арк. 7]. Аналагічная сітуацыя мела месца ў Слуцку, дзе пасля муніцыпалізацыі гарадской тэрыторыі зямельныя ўчасткі засталіся за сваімі фактычнымі карыстальнікамі на правах арэнды. Свабодныя муніцыпалізаваныя землі ў 1922 г. былі здадзены ў арэнднае карыстанне на шасцігадовы тэрмін [9, арк. 8]. Такое становішча тармазіла збіранне камунальнай гаспадаркі ў адзіную сістэму і не ўлічвала інтарэсаў саміх населеных пунктаў.

Акрамя зямельных участкаў пад апрацоўку, вялікім быў попыт на ўчасткі пад забудову. У Віцебску ў 1924 г. грамадзянам для гэтых мэт было прадастаўлена 220 участкаў плошчай ад 100 да 300 кв. дзесяцін. У пачатку 1925 г. Віцебскі камунальны аддзел адзначаў, што не можа задаволіць да 300 заяў рабочых фабрыкі «Дзвіна» па прычыне адсутнасці ў горадзе свабодных зямель [9, арк. 17 зв]. Значнай праблемай эксплуатацыі гарадской тэрыторыі стала адсутнасць планаў, якія рэгламентавалі забудову, у выніку чаго па некаторых вуліцах было немагчыма праехаць, асабліва пажарным камандам.

У мэтах павышэння прыбыткаў мясцовых бюджэтаў Дэкрэтам ад 12 лістапада 1923 г. была ўведзена зямельная рэнта. Сэнс увядзення такіх плацяжоў заключаўся ў афармленні адносін з камунальнымі аддзеламі тых землекарыстальнікаў, якія раней не ўносілі ніякіх плацяжоў за ўчасткі [2, с. 30].

Рэнтнаму абкладанню падлягалі землі, якія ўваходзілі ў гарадскую мяжу, і тэрыторыі, аддадзеныя транспарту, як у межах горада, так і па-за імі. Рэнта падзялялася на асноўную і дадатковую, першая паступала ў дзяржаўны бюджэт, другая – у мясцовыя гарадскія бюджэты. Памер асноўнай рэнты ўсталёўваўся ў парадку агульнасаюзнага заканадаўства, зыходзячы з сярэдняга прыбытку зямельнага ўчастка і суадносінаў з арэнднай платай. Дадатковая рэнта ўводзілася гарадскімі саветамі і магла вар'іравацца ў залежнасці ад месцазнаходжання зямельнага ўчастка. Плацельшчыкамі рэнты выступалі як фізічныя, так і юрыдычныя асобы [2, с. 30].

18 мая 1924 г. ЦВК і СНК СССР зацвердзілі правілы спагнання рэнты, згодна з якімі налічэннем рэнты займаліся фінансавыя аддзелы выканкамаў. З устанаўленнем зямельнай рэнты арэндная плата не спаганялася з уладанняў немуніцыпалізаваных і дэмуніцыпалізаваных; зямель, якія аддалі ў распараджэнне дзяржаўным і нацыяналізаваным прадпрыемствам; зямель, якімі валодалі ўстановы і прадпрыемствы, працуючыя на дзяржаўным бюджэце. Аднак асноўнай праблемай сталі менавіта суадносіны паміж рэнтнай і арэнднай платай. Заканадаўчыя акты перыяду 1923–1924 гг., якія рэгламентуюць дадзенае пытанне, дазвалялі паралельнае прымяненне абодвух плацяжоў, пры гэтым дадатковая рэнта магла ўключацца ў склад арэнднай платы [2, с. 30]. Варта адзначыць, што ўвядзенне рэнты прывяло да адмаўлення многімі грамадзянамі ад зямельных участкаў па прычыне неплацежаздольнасці.

У другой палове 1920-х гг. зямельная рэнта паступова набліжаецца да зямельнага падатку. 30 красавіка 1927 г. было прынята новае Палажэнне аб спагнанні рэнты з гарадскіх зямель, у адпаведнасці з якім рэнта захоўвала падзел на асноўную і дадатковую. Для вызначэння памераў асноўнай рэнты гарадскія паселішчы размяркоўваліся на катэгорыі паводле адміністрацыйнага падзелу, шчыльнасці насельніцтва, развіцця гандлю, прамысловасці і г. д. [2, с. 32].

**Заключэнне**

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі актуальнасць набыло пытанне землеўпарадкавання. Права распараджэння гарадской зямлёй было перададзена гарадскім саветам.

Першым мерапрыемствам па ідэнтыфікацыі гарадскіх зямель стала вызначэнне межаў гарадоў. Дадзены працэс абцяжарвала непаслядоўнасць заканадаўчай рэгламентацыі і адсутнасць аднастайнага плана правядзення ра-

бот. Гарады праводзілі мяжу ў адміністрацыйным парадку і ажыццяўлялі работы па адводу пры адсутнасці юрыдычнага афармлення праекта, што прыводзіла да перагляду па прычыне скаргаў насельніцтва. Пры ўваходжанні некаторых тэрыторый у склад гарадскіх іх насельніцтва працягвала плаціць сельскагаспадарчы падатак, што было нявыгадна для мясцовых бюджэтаў.

У пачатку 1920-х гг. была праведзена рэгістрацыя зямельных участкаў з выяўленнем іх фактычных землекарыстальнікаў. Перыяд НЭПа характарызаваўся высокім попытам на зямлю, як сельскагаспадарчую, так і для забудовы, таму асноўнай формай эксплуатацыі муніцыпальных зямель стала перадача іх у арэнднае карыстанне. Такое становішча прыводзіла да недахопу сялібнай тэрыторыі для развіцця горада, тармазіла збіранне камунальнай гаспадаркі ў адзіную сістэму і не ўлічвала інтарэсаў саміх населеных пунктаў.

Сродкам павелічэння прыбыткаў мясцовых бюджэтаў ад выкарыстання гарадскіх зямель стала зямельная рэнта, мэта ўвядзення якой заключалася ў афармленні зямельных адносін з камунальнымі аддзеламі тых землекарыстальнікаў, якія раней не ўносілі ніякіх плацяжоў за зямлю. Паралельна з рэнтным абкладаннем захоўвалася арэндная плата.

### *СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ*

1. ***Ящук, Т. Ф.*** Земельные отношения в городах: опыт правового регулирования в период НЭПа / Т. Ф. Ящук // Вестник Омского университета. Сер. Право. – 2015. – № 4. – С. 17–25.

2. ***Нефёдов, Л. В.*** Правовое закрепление земельной ренты в советском законодательстве / Л. В. Нефёдов // Вестник Омского университета. Сер. Право. – 2011. – № 2. – С. 30–33.

3. ***Нефёдов, Л. В.*** Органы управления городскими землями и их полномочия в РСФСР (1918 – кон. 1940 гг.) / Л. В. Нефёдов // Вестник Омского университета. Сер. Право. – 2011. – № 1 (26). – С. 67–73.

4. ***Нефёдов, Л. В.*** Правовое значение положения о земельных распорядках в городах 1925 г. / Л. В. Нефёдов // Право и политика: история и современность: тезисы докладов и сообщений межрегиональной науч.-практ. конф., Омск, 14–15 апр. 2011 г. / Омская академия Министерства внутренних дел Российской Федерации; отв. ред. Т. Е. Грязнова, М. А. Засыпкин. – Омск, 2011. – С. 134–135.

5. Советское градостроительство, 1917–1941 / Ю. Л. Косенкова [и др.]. – Москва : Прогресс-традиция, 2018. – Кн. 2. – С. 831–1490.

6. Земельный кодекс БССР // Збор законаў і загадаў рабоча-сялянскага ўраду БССР. – Мінск : НКЮБ. – 1923. – № 6. – Ст. 55.

7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 691. Воп. 1. Спр. 65.

8. НАРБ. – Ф. 691. Воп. 1. Спр. 66.

9. НАРБ. – Ф. 691. Воп. 1. Спр. 98.

10. Земельный кодекс БССР // Збор законаў і загадаў рабоча-сялянскага ўраду БССР. – Мінск : НКЮБ. – 1925. – № 11. – Ст. 93.

11. НАРБ. – Ф. 691. Воп. 1. Спр. 21.

12. НАРБ. – Ф. 691. Воп. 1. Спр. 6.

13. Аб пацвярджэнні палажэння аб зямельных распарадках у гарадах і паселішчаў гарадскога тыпу Беларускай ССР // Збор законаў і загадаў рабоча-сялянскага ўраду БССР. – Мінск : НКЮБ. – 1925. – № 43. – Ст. 353.

14. НАРБ. – Ф. 691. Воп. 3. Спр. 1.

15. Сельская гаспадарка ў м. Менску // Савецкая Беларусь. – 1922. – 12 снежня. – С. 2.

16. Наше Коммунальное хозяйство. Земельная политика Комхоза // Звязда. – 1923. – 18 лютага. – С. 3.

Паступіла ў рэдакцыю: 29.10.2023 г.

Кантакты: tatstsyana98@mail.ru (Пецюкевіч Таццяна Уладзіміраўна).

**Petsiukevich T. U. THE PROBLEM OF URBAN LAND MANAGEMENT IN THE BSSR DURING THE NEP PERIOD (1921–1928)**

*An important factor in the development of the city is the rational use of land resources. Urban land management is defined in the article as measures to make changes to the area, location, structure, boundaries of urban territories in order to create conditions for their rational use and functioning of urban economy. The author considers the problem of identification of urban lands by means of establishing the city border, as well as the features of the operation and accounting of urban lands on the territory of the BSSR during the NEP period.*

**Keywords:** land management, urban lands, urban border, public utilities.